# Вяртанне ў маладосць...

## *Успаміны жонкі народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа Лідзіі Якаўлеўны*

Калісьці даўно, у 1942 годзе, цяжкі ваенны лёс закінуў Івана Паўлавіча Мележа далёка ад Беларусі, у горад Бугуруслан. Многіх людзей прывяла вайна далёка на Усход. Маленькі і ціхі горад у першыя ж месяцы вайны напоўніўся эвакуіраванымі. У асноўным гэта былі жыхары Оршы, Віцебска, Адэсы, Масквы, Ленінграда і іншых гарадоў.

Тут амаль не было прамысловых прадпрыемстваў — адзін інстытут, бальніца і 2-3 магазіны. Рассяленне ішло па прыватных дамах і кватэрах. У нашым доме, дзе раней жылі 5 чалавек, пасялілася яшчэ 9 — дзве сям'і і курсанты лётнага вучылішча, а пазней — Іван Паўлавіч Мележ. На суседняй вуліцы, як мы даведаліся намнога пазней, жылі жонка і дачка Канстанціна Заслонава.



Іван Мележ за рабочым сталом. 1974 г.

Наша сустрэча з Іванам Паўлавічам адбылася восенню 1942 года. У той цяжкі час кожны з нас, нягледзячы на маладосць (мне было 19, яму 21 год), меў ужо свае погляды на жыццё, свае інтарэсы, ставіў перад сабой пэўныя мэты. Мы адчувалі сябе дарослымі і самастойнымі людзьмі. Іван Паўлавіч прайшоў праз вайну, яго родныя і сябры засталіся на Палессі. Я ўжо працавала, мае школьныя таварышы, брат і сястра былі на фронце. Таму мы маглі меркаваць адно аб адным, як кажуць, разважліва.

Ён звяртаў на сябе ўвагу перш за ўсё знешнім выглядам. Высокі, бледны, худы пасля ранення і знаходжання ў шпіталі, крыху дзіўна апрануты ў шырокія чорныя матроскія штаны і салдацкую гімнасцёрку, з рукой на марлевай павязцы. Вечна кудысьці спяшаўся.

Вабіла ў ім жывая зацікаўленасць усім на свеце, перш за ўсё справамі на фронце, жыццём кожнага, з кім знаёміўся: ці то мясцовага жыхара, ці то эвакуіраванага, дзіцяці або старога. Усіх распытваў, разглядваў, усім спачуваў, нешта тлумачыў. І, як я потым даведалася, занатоўваў у сваіх запісных кніжках дэталі, падзеі, вобразы. Частка гэтых запісаў апублікавана ў "Першай кнізе".

Пры далейшым знаёмстве Іван Паўлавіч здзіўляў ужо ўнутранай чысцінёй, святлом, натхненнем у шэрых вачах, незвычайнай любоўю і верай у чалавека і ў вялікую сілу літаратуры. Такая натхнёнасць захапляла людзей і адначасова ставіла ў тупік: вельмі ж яна не адпавядала цяжкасцям таго часу. Іван Паўлавіч здаваўся чалавекам з іншага свету. Не разумеючы, не знаходзячы прычыны для гэтага, некаторыя тлумачылі ўсё асаблівым паходжаннем і выхаваннем.

Пры сустрэчах са мной, маўклівым і замкнёным па натуры чалавекам, больш гаварыў сам. Мала расказваў пра вайну, больш за ўсё — пра сваякоў і Палессе. Хойніччына ў яго ўспамінах была казачным краем з бязмежнымі лясамі, балотамі, надзвычай смачнымі антонаўскімі яблыкамі, ягадамі, грыбамі, добрымі людзьмі, цудоўнымі песнямі, якія ён часта з задавальненнем спяваў.

Увесь час непакоіўся аб сваіх бацьках і сваяках. Маці, паводле яго аповедаў, уяўлялася вясёлай жанчынай, поўнай народнай мудрасці, якая любіла песню, але была запальчывай і хуткай на плескачы. Бацька падаваўся добрым, дасведчаным яшчэ з часоў шматгадовай службы ў арміі. А сястрычка Юля — будучай актрысай, бо "яна так і лезе на сцэну". Многа гаварыў пра хату (якая згарэла) і сад.

Толькі ў 1945—1956 гадах, калі пазнаёмілася з людзьмі і прыродай Палесся, я пераканалася ў дакладнасці аповедаў Івана Паўлавіча і аб'ектыўнасці яго ўспрымання горача любімага роднага краю. Я атрымала яшчэ адно пацвярджэнне асаблівага дару Івана Паўлавіча бачыць прыгожае ў звычайным, штодзённым.

Свае апавяданні ён звычайна падмацоўваў замалёўкамі, выкрэсліваннем плана. У тыя гады ён наогул любіў маляваць, гаварыў, што ў дзяцінстве хацеў стаць мастаком.

На маё пытанне аб тым, чым ён будзе займацца пасля вайны, Іван Паўлавіч цвёрда, без ваганняў адказаў, што стане пісьменнікам. Я засмяялася і адказала фразай, якую ён запомніў на ўсё жыццё. І калі быў ужо вядомым пісьменнікам, то ўспамінаў яе мне і сваім знаёмым. А я сказала з іроніяй, што мне якраз не стае ў доме аднаго пісьменніка.

Справа ў тым, што ўсё дарослае пакаленне нашай сям'і нешта пісала: хто вершы, хто апавяданні, хто п'есы. Маці марыла напісаць нават раман аб сваіх блуканнях па дарогах грамадзянскай вайны са сваім мужам, дывізіённым камісарам. Усе пісалі дрэнна, па сутнасці, нават не ведаючы граматыкі рускай мовы. Надзеі маіх сваякоў грунтаваліся, відаць, на тым, што нехта з далёкай радні некалі даўным даўно служыў у маёнтку пісьменніка С.Г.Аксакава, аб чым любілі ў нас расказваць. Дарэчы, Івану Паўлавічу падабаліся раманы "Сямейная хроніка" і "Дзіцячыя гады Багрова-ўнука". Ён заўсёды раіў прачытаць іх падрастаючым дочкам.



Іван Мележ з жонкай Лідзіяй Якаўлеўнай, дачкой Людмілай і бацькам Паўлам Фёдаравічам. 1955 г.

Нягледзячы на вялікія матэрыяльныя цяжкасці тых гадоў, жыццё для нас было радасным, напоўненым справамі, падзеямі і, галоўнае, надзеямі на будучае. Было многа сяброў сярод студэнтаў педагагічнага інстытута, дзе Іван Паўлавіч працаваў ваенруком. Засталіся ў горадзе яшчэ нейкія мае школьныя таварышы, былі знаёмыя сярод выкладчыкаў інстытута, якія ў тыя гады неяк зліваліся са студэнтамі ў адзіных інтарэсах, сярод курсантаў ваенных вучылішч і інвалідаў вайны.



Іван Мележ — намеснік палітрука артылерыйскага палка. 1941 г.

Апрача працы і вучобы, сустрэч з сябрамі, Іван Паўлавіч праводзіў шмат часу за напісаннем вершаў (яны друкаваліся ў "Бугурусланской правде"), апавяданняў, вядзеннем дзённікаў. Уважліва сачыў за падзеямі на фронце. Штодзённа слухаў перадачу "У апошні час", усе змены на лініях франтоў заносіў чырвоным алоўкам на карту еўрапейскай часткі СССР, якая ляжала ў яго ў афіцэрскім планшэце.

Зрэдку (бо не было грошай) хадзілі ў кіно, тэатр, на танцы. А часцей гулялі па горадзе ці хадзілі на лыжах. Я магла толькі збольшага рухацца на роўным месцы, а ён катаўся з высокіх узгоркаў, і было страшна глядзець, як ляціць уніз без палак з перавязанай параненай рукой.

10 красавіка 1943 года, нікому нічога не сказаўшы, мы пайшлі ў ЗАГС і распісаліся. Абое лічылі, што гэта вельмі асабістая справа і ніякага шумнага вяселля нам не трэба. І пазней, усё жыццё, Іван Паўлавіч не любіў пышных вяселляў: лічыў, што яны робяцца не для маладых, а для іх бацькоў і знаёмых бацькоў, а таксама для паказухі.

Пасля ЗАГСа мы гулялі па горадзе, пастаялі на мосце праз раку Кінель (была паводка), потым спусціліся ўніз і доўга сядзелі на лесвічных прыступках, гледзячы на шырачэзную водную роўнядзь.

Шлюб мала чаго змяніў у нашым жыцці. Праца, вучоба, выстойванне ў шматлікіх чэргах за хлебам... Горад жыў цяжка. Усё трэба было здабыць самім. Прадукты па картачках, адзенне ў тры разы даражэйшае, чым на базары, дровы — галлё ў лесе. Толькі маладосць, каханне і мары пакінулі ў памяці светлыя плямы. А потым было трыццаць з лішнім гадоў жыцця, якое прамільгнула, як адзін дзень. Для Івана Паўлавіча гэта амаль цалкам жыццё для літаратуры і ў імя літаратуры. Мне ўяўляецца яно гераічным, калі ўсё — і жыццё, і каханне, і сілы — аддаецца на пераадольванне перашкод, якія паўстаюць часам і як рэальныя, і як спакусы ў выглядзе высокіх выгадных пасад, душэўнага спакою, вялікіх грошай. Духоўныя каштоўнасці, якія ствараюцца такімі людзьмі, аказваюцца куды больш дарагімі і жывучымі, чым каштоўнасці матэрыяльныя.

Для мяне Іван Паўлавіч увесь у яго кнігах. Там, дзе аб'ектыўна адлюстроўваліся погляды і вобразы іншых людзей, увасобіліся і яго думкі, і яго ўчынкі, і яго вобраз, а таксама дробныя эпізоды з жыцця.

Іван Паўлавіч цярпець не мог і ў жыцці, і ў літаратуры грубасці, пошласці, кар'ерызму, мяшчанства, імкнення некаторых нават у літаратуры акружыць сябе падхалімамі і халуямі.

За тыдзень да смерці, ідучы ў бальніцу, ён застаўся верным сабе, захапіў з сабой апошнія старонкі рамана "Завеі, снежань..." — спадзяваўся дапісаць, калі стане адчуваць сябе лепш. У адзін з апошніх сваіх дзён, праводзячы мяне па бальнічным калідоры, з сумам сказаў: "Не дапішу. Няма сіл. Стаміўся жыць".

Хачу сказаць, што за 33 гады сумеснага жыцця муж мала ў чым змяніўся, у параўнанні з тымі першымі ўражаннямі, якія ён зрабіў на мяне. Застаўся такім жа сумленным, чыстым, мэтанакіраваным, адданым літаратуры. Толькі стаў часцей хмурыцца, лепш разбірацца ў людзях, больш настойліва дабівацца прызнання сваіх поглядаў.

**Матэрыялы культуралагічнага дадатку падрыхтаваў Мікола ЧЭМЕР. Фота аўтара.**